Радыё Свабода

СУД

# Па 15 сутак Статкевічу, Пальчысу, Цыгановічу, 30 — Севярынцу. Суды 15 чэрвеня за перадвыбарчыя пікеты

15 чэрвень 2020, 12:25

АБНОЎЛЕНА 15 чэрвень 2020, 22:10

**У панядзелак 15 чэрвеня працягваюцца суды над удзельнікамі збораў подпісаў за вылучэньне альтэрнатыўных кандыдатаў у прэзыдэнты. Як піша «Вясна», Эдуарду Пальчысу — 15 дзён арышту, ужо зьняволенаму Ўладзімеру Цыгановічу праз Skype — яшчэ 15 дзён.**

УЖЫВУЮ Выбары-2020. Як праходзіць прэзыдэнцкая кампанія падчас пандэміі

## Пальчыс

Блогер **Эдуард Пальчыс**, які стаў вядомым праз публікацыі на сайце 1863x.com, цяпер вядзе Telegram-канал Palchys. Там ён публікаваў сярод іншага відэа з чэргаў на пікеты за вылучэньне альтэрнатыўных кандыдатаў у прэзыдэнты на менскай Камароўцы.

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
Блогера Пальчыса асудзілі на 15 сутак арышту за «несанкцыянаваную акцыю» ля Камароўкі

У судзе Кастрычніцкага раёну Менску Пальчысу прысудзілі 15 дзён арышту за нібыта ўдзел у «несанкцыянаванай акцыі», хоць пікеты для збору подпісаў на Камароўцы былі цалкам легальнымі. Як адзначае Telegram-канал Nexta, Пальчыс «ніякіх лёзунгаў нават не выкрыкваў, а проста здымаў на відэа тое, што адбывалася».

## Статкевіч і Вінярскі

Мікола Статкевіч меў выйсьці на волю пасьля 15 сутак арышту за «несанкцыянаваную акцыю» на Камароўцы, але 15 чэрвеня яго зноў асудзілі — як піша яго жонка Марына Адамовіч, дыстанцыйна і ў адсутнасьць адваката. Дакладны вырак ёй адмовіліся паведаміць, але Статкевіч «знайшоўся» ў Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў на 1-м завулку Акрэсьціна.




**ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:**

Тры гадзіны ў чарзе, каб аддаць подпіс. Пікеты і затрыманьні 31 траўня. Сьцісла пра галоўнае. ФОТА і ВІДЭА


Судзіць Статкевіча мела судзьдзя суду Маскоўскага раёну Тацяна Мотыль. Як пазьней паведаміла «Вясна», прысуд Статкевічу — 15 сутак.

Таксама дыстанцыйна ў тым жа судзе разглядалі справу паплечніка Статкевіча Максіма Вінярскага. Вырак такі самы: 15 сутак арышту.

## Севярынец

Сустрашыня Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі асуджаны ўжо на 75 сутак арышту, піша на Facebook яго жонка Вольга Севярынец. 15 чэрвеня яго асудзілі паводле яшчэ двух пратаколаў за «несанкцыянаваныя акцыі.




**ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:**

Севярынца ў турме на Акрэсьціна яшчэ двойчы асудзілі на 15 сутак арышту, яго жонка заявіла пра катаваньні

«Забралі ўсе рэчы, у тым ліку зубную шчотку, цёплую вопратку, сродкі гігены, а таксама ўжо два разы адпраўлялі ў КПЗ, дзе вельмі халодна, — піша Вольга Севярынец. — Паша просіцца, каб перадалі перадачу хоць нейкую, але мы ня можам гэтага зрабіць, бо перадачы не прымаюць.

Я вельмі прашу, калі неяк можна паўплываць на тое, што з ім робяць, дапамажыце, бо яго там заб'юць».

Першыя 15 сутак Севярынцу прысудзілі 8 чэрвеня. Яшчэ да таго выраку Севярынец меў неадбытыя прысуды на 30 сутак за акцыі пратэсту супраць «паглыбленья інтэграцыі».

## MozgOn

Справу Цыгановіча разглядала ў судзе Кастрычніцкага раёну судзьдзя Вера Галаўкова. Блогер быў дыстанцыйна «выдалены» да пачатку Skype-паседжаньня, бо патрабаваў ад Галаўковай доказаў таго, што яна зьяўляецца судзьдзёй.

Сьведкам выступаў супрацоўнік АМАП Сяргей Сіманаў, які сьцьвярджаў, што Цыгановіч «выкрыкваў лёзунгі, праяўляў непавагу да ўладаў», а таксама крычаў «Жыве Беларусь!» і «Свабоду Ціханоўскаму!» на менскай Камароўцы 31 траўня. Вырак — яшчэ 15 содняў у дадатак да тых, што Цыгановіч ужо адбывае паводле прысуду трохмесячнай даўніны.

Цыгановіч — аўтар каналаў пад агульнай назвай MozgOn. На Youtube мае звыш 76 тысяч падпісантаў, на канал у Telegram падпісаныя амаль 6 тысяч карыстальнікаў.

**ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:**
«Гэтак рабіць нельга». Што кажа дзядуля-вэтэран пра свайго ўнука — блогера MozgON, якога адправілі на 15 сутак

## Маслоўскі

У судзе Фрунзэнскага раёну Менску судзьдзя Ала Бушава разглядае адміністрацыйную справу блогера **Мікалая Маслоўскага**. Яго вінавацяць ва ўдзеле ў «несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве» 31 траўня, падчас збору подпісаў каля Камароўскага рынку. Вынік суду — 15 сутак арышту.

Блогер адзначыў у судзе, што яму не паведамілі належным чынам пра суд, казаў пра іншыя працэсуальныя парушэньні. Ён ня лічыць, што ў той дзень удзельнічаў у акцыі — настойвае на тым, што пастаянна перасоўваўся і вёў відэатрарсьляцыю. Маслоўскі сьцьвярджаў, што мерапрыемства каля Камароўскі было цалкам законным. Сьведкам выступіў камандзір групы АМАП Віталь Шыш. Маслоўскі сваімі пытаньнямі заблытаў яго, і Шыш, як піша «Вясна», не змог нічога ўцямна патлумачыць.

## Качурэц

Суд Чыгуначнага раёну Віцебску 15 чэрвеня асудзіў на 10 сутак актывіста Міколу Качурца за ўдзел у пікеце па зборы подпісаў за Сьвятлану Ціханоўскую. Двое сутак актывіст правёў у ізалятары часовага ўтрыманьня яшчэ да суду. Судовае паседжаньне праходзіла ў рэжыме скайп-канфэрэнцыі.

Міколу Качурца затрымалі ў суботу 13 чэрвеня каля свайго дома.

***

Таксама 15 чэрвеня разглядаюць іншыя справы, зьвязаныя з выбарчай кампаніяй. У Менску праходзіць дыстанцыйны суд над **Максімам Вінярскім**.

У Наваполацку **Алену Радзькову** пакаралі штрафам у 810 рублёў. Яе судзілі паводле арт. 23.34 КаАП за тое, што 28 траўня яна ўзяла ўдзел у «несанкцыянаваным пікетаваньні».

**ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:**
Максім Урбановіч заявіў пра зьдзекі ў ізалятары на Акрэсьціна

## Прэзыдэнцкія выбары — 2020 у Беларусі. Што важна ведаць

- Шостыя ў гісторыі сувэрэннай Беларусі выбары прэзыдэнта прызначаныя на нядзелю, **9 жніўня 2020 году**.
- 65-гадовы **Аляксандар Лукашэнка** кіруе дзяржавай 25 гадоў. Ніводныя прэзыдэнцкія выбары (2001, 2006, 2010, 2015), апроч першых (1994 год), не прызналі свабоднымі і справядлівымі на міжнародным узроўні.
- Старшыня ЦВК **Лідзія Ярмошына** адхіліла прапановы праваабаронцаў аб дыстанцыйных прэзыдэнцкіх выбарах у час эпідэміі COVID-19, бо «часу для прыняцьця гэтых захадаў ужо няма». Лукашэнка ня бачыў падставаў пераносіць выбары праз пандэмію.
- ЦВК зарэгістраваў 15 ініцыятыўных груп з 55 заявак.
- Аўтару YouTube-канала «Страна для жизни» **Сяргею Ціханоўскаму** Цэнтральная выбарчая камісія адмовіла ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, бо ён адбываў 15 сутак арышту і ня мог асабіста падаць дакумэнты. Тады сваю ініцыятыўную групу ў ЦВК заявіла жонка блогера **Сьвятлана Ціханоўская**.
- 29 траўня на перадвыбарчым пікеце жонкі затрымалі Ціханоўскага і яшчэ 9 чалавек. Лукашэнка казаў пра акалічнасьці затрыманьня за 4 гадзіны да таго, як яно адбылося.
- 11 чэрвеня ў «Белгазпрамбанку» і шэрагу іншых кампаній прайшлі ператрусы. У Камітэце дзяржкантролю заявілі, што завялі крымінальныя справы аб легалізацыі сродкаў, атрыманых злачынным шляхам, і аб ухіленьні ад сплаты падаткаў у асабліва буйным памеры. Старшыня КДК **Іван Тэртэль** сьцьвярджаў, што да гэтых спраў мае дачыненьне патэнцыйны кандыдат у прэзыдэнты **Віктар Бабарыка**. Роўна за 4 гадзіны да заявы Дзяржкантролю **Аляксандар Лукашэнка** расказаў пра акалічнасьці «справы „Белгазпрамбанку“».
- 18 чэрвеня Віктара Бабарыку і яго сына, кіраўніка ініцыятыўнай групы Эдуарда Бабарыку затрымалі.
- 14 ліпеня ЦВК зарэгістраваў кандыдатамі ў прэзыдэнты **Аляксандра Лукашэнку**, **Сьвятлану Ціханоўскую**, **Ганну Канапацкую**, **Андрэя Дзьмітрыева** і **Сяргея Чэрачня**. Не зарэгістравалі **Віктара Бабарыку** і **Валера Цапкалу**.
- Ад пачатку выбарчай кампаніі праваабаронцы налічылі больш за 1300 затрыманых: удзельнікі «ланцугоў салідарнасьці», сябры ініцыятыўных груп,

актывісты, палітыкі, блогеры, журналісты і проста мінакі на вуліцы. Сотні чалавек пакаралі адміністрацыйнымі арыштамі і аштрафавалі.